УДК 372.881.161

В. І. Свірыдзенка, дац., канд. пед. навук
(БДПУ, г. Мінск)
В. І. Цірынава, дац., канд. пед. навук
(НІА, г. Мінск)

# ПРЫЗНАЧЭННЕ QR-КОДАЎ У ДРУКАВАНЫХ ВУЧЭБНЫХ ВЫДАННЯХ НОВАГА ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАГА КОМПЛЕКСУ «НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ»

У адукацыйным працэсе сучаснай школы традыцыйна выкарыстоўваецца вялікая колькасць друкаваных, аўдыя- і аўдыявізуальных крыніц інфармацыі. Вучэбнай кнізе належыць сярод іх вядучае месца. Апошнім часам актыўна выкарыстоўваюцца папяровыя вучэбныя выданні, пашыраныя электроннымі дадаткамі.

Так, у 2021–2022 навучальным годзе першыя класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання працуюць па новым вучэбна-метадычным комплексе (ВМК) «Навучанне грамаце». У склад яго ўваходзіць некалькі друкаваных вучэбных выданняў, якія ўтрымліваюць QR-коды. Апошнія выконваюць шэраг функцый:

• дазваляюць прагледзець анімацыйныя фільмы адукацыйнага характару;

• дапамагаюць ажыццявіць віртуальнае падарожжа па родным краі і прачытаць адпаведныя геаграфічныя назвы;

• адсылаюць да спіса літаратурных крыніц, выкарыстаных у вучэбным выданні.

Праілюструем канкрэтнымі прыкладамі варыянты звароту да электронных дадаткаў вучэбных выданняў на ўроках навучання грамаце.

На кожнай старонцы вучэбнага дапаможніка «Буквар» [1], якая знаёміць навучэнцаў з новай літарай, змешчаны QR-код, пры дапамозе якога арганізуецца прагляд анімацыйнага фільма нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» з серый «Беларуская азбука» (2016 г.), «Вясёлыя літары» (2017 г.), «Займальная азбука» (2018 г.), «Гісторыя ад Кірыліцы» (2020 г.). У ходзе прагляду мультфільмаў, прысвечаных кожнай літары беларускага алфавіта, першакласнікі адшукваюць і называюць словы з вывучаемай літарай.

Напрыклад, на ўроку навучання чытанню па тэме «Гукі [н], [н'], літара Н» [1, с. 74] пасля прагляду анімацыйнага фільма вучні называюць словы і словазлучэнні наводзіць чысціню, непаседа, навадненне, незвычайнае здарэнне, вызначаюць, які гук абазначае літара Н у названых словах.





У вучэбнае выданне «Спадарожнік буквара» [1], прызначанае для работы з добра чытаючымі і высокаматываванымі навучэнцамі, уключана рубрыка «Ведай свой край!», якая змяшчае геаграфічныя назвы, у пачатку якіх ёсць вывучаемая літара. Тут жа размешчаны QR-код, пры дапамозе якога ажыццяўляецца прагляд фотаздымкаў і відэаролікаў адукацыйнага характару. Зварот да ўказанай рубрыкі арганізуецца на ўроку навучання чытанню пры знаёмстве з правіламі выкарыстання вялікай літары ў словах.

Напрыклад, на ўроку навучання чытанню па тэме «Гукі [н], [н'], літара Н» падчас замацавання ўяўленняў пра работу літары Н вучні разглядаюць малюнкі ў буквары і аналізуюць гукавыя схемы слоў ноты, ніткі. Арганізуецца гутарка па пытаннях: «Які гук абазначаны літарай Н у словах? Якая літара працуе для абазначэння гэтага гука ў слове — малая ці вялікая? Ці ёсць у нашым класе вучні, чые імёны ці прозвішчы пачынаюцца з гукаў [н], [н']? Гэтыя вучні могуць устаць. Няхай кожны, хто ўстаў, назаве сваё імя або прозвішча. Калі ўсё правільна, мы ўсе запляскаем у далоні. З якой літары напішам імёны і прозвішчы гэтых вучняў? Чаму?»

У далейшым арганізуецца чытанне геаграфічных назваў у спадарожніку буквара (Нароўля, Навагрудак, Наваполацк Няміга, Нясвіж, Нясвіжскі замак, рака Нёман, возера Нарач*),* прагляд адпаведных фотаздымкаў і відэаролікаў [2, с. 74].

Праводзіцца гутарка па пытаннях: «Якую назву замка вы толькі што прачыталі? У якім горадзе знаходзіцца Нясвіжскі замак? У якім з гарадоў, назвы якіх вы прачыталі, таксама ёсць замак?» *(Навагрудак.*. Настаўнік дэманструе фотаздымак Навагрудскага замка.)

У дапаможніку для першага класа «Пропісі з анімацыяй» [3] змешчаны QR-коды, якія даюць магчымасць прагледзець відэаролікі, што дэманструюць напісанне асноўных элементаў літар, асобных літар і іх злучэнняў. Узоры напісання літар змешчаны на лістах з разлінейкай, прынятай у вучэбных дапаможніках па пісьму, што дазваляе наблізіць кожную інтэрактыўную дэманстрацыю да рэальных умоў напісання літары ў пропісі і правесці аналогію паміж вобразам літары на экране і размяшчэннем літары на рабочым радку сшытка. Пры дапамозе інтэрактыўнага элемента «Зорачка» ўвага навучэнцаў фіксуецца на ключавых кропках: пачатак пісьма літары (элемента літары), перасячэнне або дотык да верхняй (ніжняй) лінейкі рабочага радка, перасячэнне элементаў літар, дасягненне неабходнай вышыні вялікіх літар і верхніх (ніжніх) элементаў малых літар, канцавая кропка пісьма элементаў

літар. Зорачка з›яўляецца на некалькі секунд у момант дасягнення ключавой кропкі і знікае пасля яе праходжання.

Інтэрактыўная дэманстрацыя напісання літар выкарыстоўваецца на ўроках навучання пісьму і па-за іх межамі. Яна прад›яўляецца на экранах персанальных тэхнічных прылад (планшэтаў, смартфонаў) для арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў або на экране інтэрактыўнай дошкі для арганізацыі франтальнай работы з класам.

Напрыклад, на ўроку навучання пісьму па тэме «Малая літара н» падчас увядзення новага спосабу дзеяння (узор напісання малой літары н) спачатку праводзіцца аналіз размяшчэння элементаў літары адносна рабочага радка. Потым настаўнік дэманструе ўзор напісання малой літары н з падрабязным каментарыем: «Ад верхняй лінейкі рабочага радка ўніз вядзём прамую лінію да ніжняй лінейкі рабочага радка. Ад сярэдзіны прамой вядзём лінію ўправа, плаўна падымаем уверх, даводзім да верхняй лінейкі. Пішам прамую з закругленнем унізе: зверху ўніз вядзём прамую лінію, не даводзячы яе да ніжняй лінейкі, робім закругленне ўправа, дакранаемся да ніжняй лінейкі і плаўна падымаем лінію ўверх».

У далейшым вучні пішуць у паветры малую літару н з апорай на люстраны ўзор настаўніка і знаёмяцца з інтэрактыўная дэманстрацыяй яе напісання пры дапамазе QR-кода [3, с. 24].

У дапаможніку для першага класа «Пазакласнае чытанне» [4, с. 80] змешчаны QR-код, пры дапамозе якога чытачы (настаўнік, вучні) маюць магчымасць пазнаёміцца са спісам кніг, у якіх прадстаўлены творы, рэкамендаваныя для пазакласнага чытання ў 1 класе. Пры неабходнасці гэтыя кнігі могуць быць узяты ў бібліятэцы і прачытаны поўнасцю.

Такім чынам, для сучаснага вучэбна-метадычнага комплексу «Навучанне грамаце» ўласціва наяўнасць новых тэхналогій падрыхтоўкі і прад'яўлення вучэбнай інфармацыі.

**Літаратура**

1. Свірыдзенка, В. І. Буквар: вучэб. дапам. для 1-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2021.
2. Свірыдзенка, В. І. Спадарожнік буквара: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2021.
3. Свірыдзенка, В. І. Прапісі з анімацыяй / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: Аверсэв, 2021.
4. Свірыдзенка, В. І. Пазакласнае чытанне / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск: Аверсэв, 2021.





УДК 37

С. В. Снапковская, проф., докт. пед. наук, докт. ист. наук
(БГУ, г. Минск)

# СОЗДАНИЕ БЕЛОРУССКОЯЗЫЧНОЙ УЧЕБНОЙ ЛИТЕРАТУРЫ: ИСТОРИКО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ОПЫТ

К появлению специальной учебной литературы, как специфической педагогической основы, ее функции выполняло устное народное творчество. Традиционно фольклором «живились» в каждую эпоху великие национальные писатели, просветители и педагоги. Но в белорусской литературе процесс перехода фольклорных форм к новой художественной системе был *замедлен*. Долгое время белорусский фольклор заменял печатное слово в детской литературе. Когда белорусский язык приобрел письменную литературную форму на основе устной; эта сильная связь между ними в дальнейшем не прерывалась, она трансформировалась в устойчивую традицию национальной детской литературы [1, с.162].

В *XIX* в. на белорусском языке разрешалось печатать только фольклорные материалы, исторические документы и памятники. Первым обширным собранием материалов по белорусскому языку явился «Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае», собранный учащимися Молодечненской учительской семинарии и изданный в Вильно в 1866 г. К 60-70- м гг. XIX в. относится плодотворная деятельность белорусского ученого и педагога И. Носовича, составителя первого крупного (30-тысячного) «Словаря Белорусского наречия», изданного в Петербурге Императорской академией наук в 1870 г. Обширный сборник «Белорусских песен» П.Бессонова был напечатан в Москве в 1871 г. В Петербурге было опубликовано крупное и весьма ценное издание «Труды этнографическо-статистической экспедиции в западно-русский край, снаряженной Императорским русским географическим обществом Юго-западного отделения. Материалы и исследования, собранные П.П.Чубинским», где был записан целый ряд белорусских говоров Минской, Черниговской и Гродненской губерний [2, с.950]. Известным российским ученым М. П. Погодиным в Витебской губернии были собраны материалы для издания «Словаря белорусского наречия». В 1873 г. в комментариях к будущему словарю он отмечал исключительную важность этой работы, поскольку «сие наречие есть общее для крестьян Смоленской, Белорусских и некоторых Полтавских губерний для объяснения некоторых мест в древней нашей словесности» [3, л. 1].